■ Ідэі маладых

КРЭАТЫЎ + ІНІЦЫЯТЫВА + БІЗНЕС

60 бізнес-праектаў, распрацаваных студэнтамі 16 ВНУ, былі прадстаўлены ў Пінску на першым рэспубліканскім форуме маладзёжнага стартап-руху. Маштабнае мерапрыемства праходзіла на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, а яго арганізатарам і ініцыятарам выступіла Міністэрства адукацыі.

Ацэньваў наватарскія ідэі экспертны савет, які ўзначаліў міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў. У савет увайшлі таксама старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін, намеснік дырэктара адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Аляксандр Марцінкевіч, прадстаўнікі бізнес-супольнасці, прадпрыемстваў і арганізацый. Прэзентацыя праектаў праходзіла ў фармаце краш-тэстаў, што дазваляла бізнесменам-пачаткоўцам вызначыць узровень перспектыўнасці сваёй прапановы, атрымаць рэкамендацыі па ўдасканаленні праекта, а магчыма, і грант на рэалізацыю сваёй ідэі.

У краіне зараз ідзе актыўная праца па прасоўванні студэнцкіх стартап-праектаў. Спецыяльныя мерапрыемствы па навучанні тых, хто хоча прадставіць сваю ідэю інвестарам (як трэба праводзіць прэзентацыю, як распрацаваць бізнес-план, дзе шукаць інвестараў), арганізуюць і самі ВНУ. Таму галоўнай задумай форуму было стварыць умовы для таго, каб маладосць, крэатыў, ініцыятыва і бізнес знайшлі адзін аднаго.

Міністэрства адукацыі выдзяліла гранты на рэалізацыю трох студэнцкіх стартап-праектаў. У намінацыі «Самы інавацыйны бізнес-праект» грант ад Мінадукацыі (і планшэт кіраўніку праекта) быў уручаны **камандзе Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта** за распрацоўку пад мудрагелістай назвай «Тэрмамеханічна мадыфікаваная драўніна для вырабу верхняга слою паркета». Студэнтам удалося палепшыць фізіка-механічныя ўласцівасці мяккаліставых парод за кошт ушчыльнення пад гарачым прэсам. Гэты спосаб дазваляе дадаткова абараніць паркет ад агрэсіўнага асяроддзя.

У намінацыі «Самы камерцыйна перспектыўны бізнес-праект» перамагла **каманда БНТУ** з інавацыйнай ідэяй «Студэнцкае бюро праектавання крэатыўнай упакоўкі». Маладыя людзі атрымалі грашовы грант на рэалізацыю ідэі, прыз ад Банка развіцця і медыяплэер.

Трэці грант быў уручаны **камандзе БДЭУ** за праект «Закон чысціні», прадстаўлены ў намінацыі «Самы крэатыўны падыход да вырашэння актуальнай праблемы». Размова ідзе пра вытворчасць тары для кавы, у саставе якой будзе ўносіцца насенне раслін. Такі карысны «посуд» за кошт прарошчвання насення і біясінтэзу раслін зможа штогод выводзіць каля адной тоны вуглякіслага газу з атмасферы. Экалагічны эфект відавочны.

У намінацыі «Найлепшая каманда праекта» ў секцыі «Бізнес-праект» (камерцыйны) перамагла **каманда Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій (ДІКСТ) БДУ.** Студэнты прадставілі праект «Веларыцар». Іх распрацоўка дапаможа знізіць колькасць крадзяжоў двухколавых машын за кошт выкарыстання спецыяльных велатрэкераў. У якасці ўзнагароды каманда атрымала сертыфікат ад Парка высокіх тэхналогій, які дае права на працягу паўгода навучацца ў гэтай арганізацыі.

А ў намінацыі «Народнае прызнанне» ў секцыі «Сацыяльны праект» найлепшым быў прызнаны праект «Нарачанская рэспубліка», прадстаўлены таксама **студэнтамі ДІКСТ БДУ.** Асноўная яго ідэя заключаецца ў наданні тэрыторыі Нарачы асаблівага статусу. «Нарачанская рэспубліка» будзе надзеленая сваімі «правамі», «правіламі» і «канстытуцыяй», што дазволіць стварыць спецыфічны адметны каларыт гэтай мясцовасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■